УДК 936.7 «03/11»

***У.В. Тугай,***
*доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі старажытных цывілізацый і сярэдневякоўя БДПУ,*
***У.У. Грыгор'еў,***
*магістрант кафедры гісторыі старажытных цывілізацый і сярэдневякоўя БДПУ*

# СЛАВЯНЕ І ІХ ПРОДКІ Ў ЛІТАРАТУРНАЙ ТРАДЫЦЫІ IV–VII стст. н. э.

Праблема славян надзвычай актуальная, а іх паходжанне, месцы пражывання, міграцыі выклікаюць шмат спрэчак у навуковым свеце і сярод грамадзян, якія цікавяцца сваёй этнічнай гісторыяй.

Сутнасць дыскусіі вакол продкаў славян – венетаў (энетаў, венедаў, вендаў) зводзіцца да адказу на пытанне: «Былі яны славянамі ці не?».

Большасць славянскіх аўтараў схільны бачыць у венетах сваіх далёкіх продкаў, хоць гэта думка не заўсёды дастаткова абгрунтавана і не падзяляецца ўсімі навукоўцамі [1]. Ёсць і тэндэнцыйныя погляды [2, с. 70].

Мэта дадзенага артыкула – аб'ектыўна паказаць ход гісторыі ў Еўропе і месца ў ёй продкаў славян у IV ст. н. э.

Упершыню аб венетах у «дзяржаве Эрманарыха» мы даведваемся ў гоцкага гісторыка VI ст. Іардана, з яго сачынення «Аб паходжанні і ўчынках гетаў» [3, с. 65–130], якое ў навуковай літаратуры носіць назву «Гетыка». Варта адзначыць, што Іардан выкарыстаў інфармацыю не дайшоўшых да нас твораў Алабія і Касіадора канца V – пачатку VI ст. н. э. Але існуе меркаванне, што венеты на тэрыторыі Еўропы пражывалі і раней.

Першыя звесткі аб славянскім племянным свеце з'яўляюцца ўжо напярэдадні Вялікага перасялення народаў. У папярэдняе Маркаманскім войнам стагоддзе славяне былі занадта аддаленыя ад меж Рымскай імперыі. Але ўсё ж такія лацінскія аўтары, як Пліній Старэйшы і Тацыт, вылучаюць іх як асобную этнічную супольнасць пад назвай «венеты» («венеды»). Паводле Плінія, венеты пражывалі на паўднёва-ўсходнім узбярэжжы Балтыйскага мора на ўсход ад Віслы. Суседзямі іх былі германцы-інгевоны, якія, магчыма, і далі ім такую назву. Праз паўстагоддзя Тацыт, калі адзначаў этнічнае адрозненне германскага, славянскага і сармацкага свету, адводзіў венетам шырокую тэрыторыю паміж Балтыйскім узбярэжжам і Прыкарпаццем [4, с. 458–483]. Александрыйскі навуковец Клаўдзій Пталемей таксама сведчыць аб рассяленні вельмі шматлікага народа венетаў у гэтым рэгіёне [5, с. 84].

Венетаў, якія размяшчаліся на велізарнай прасторы Цэнтральнай Еўропы, у басейне Віслы, археолагі звязваюць з пшэворскай культурай (канец II ст. да н. э. – V ст. н. э.), а сярод іх носьбітаў, па меркаванні археолагаў, знаходзіліся славяне [6, с. 377]. Аднак яна сустракаецца і на заселеных германцамі землях. Гэта культура названа па могільніку каля горада Пшэворск. Селішчы пшэворскай культуры неўмацаваныя, жыллё – наземныя слупавыя пабудовы, радзей – паўзямлянкі. Могільнікі бескурганныя, у пахаваннях адкрытыя рэшткі трупаспаленняў. Асновай гаспадаркі насельніцтва пшэворскай культуры з'яўляліся земляробства і жывёлагадоўля. З рамёстваў былі асабліва развітыя ганчарнае, кавальскае, ювелірнае. У культурных пластах селішчаў знаходзяць жалезныя сярпы, сякеры, лемехі і вялікую колькасць ляпной керамікі. Сярод знаходак жалезныя сашнікі і жалезная зброя: двухлязовыя наканечнікі дзід, жалезныя нажы [6, с. 377–378]. У наш час вывучэнне славянскіх і германскіх старажытнасцей знаходзіцца ў стадыі вывучэння. Прыкладна перад пачаткам Вялікага перасялення народаў славяне ўваходзяць у склад насельніцтва пшэворскай культуры. Элементы гэтай культуры канцэнтруюцца паміж Верхнім Паднястроўем і Сярэднім Падняпроўем, якія ўключаюць лесастэп верхняга і сярэдняга цячэння Паўднёвага Буга. Магчыма, частка славян Усходняй Еўропы была сканцэнтраваная менавіта тут.

Такім чынам, напярэдадні Перасялення (II – III стст. н. э.) асноўны масіў славянскіх плямёнаў займаў тэрыторыю ад берагоў Балтыйскага мора да паўночных схілаў Карпацкіх гор, перш за ўсё – басейн Віслы. На захадзе славяне межаваліся з германскім і кельцкім племянным светам, на ўсходзе – са светам балтыйскіх і фіна-угорскіх плямёнаў, на поўдні і паўднёвым усходзе іх суседзямі з'яўляліся сарматы. Такім чынам, славянскія плямёны венетаў – той самы ствол, ад якога пасля адлучыліся іншыя славянскія групы [7].

На першым этапе Вялікага перасялення народаў у якасці часткі Барбарыкума (так звалі варварскі свет) славяне ўключыліся ў агульны паток міграцыйных працэсаў і процістаянне Рымскай імперыі. Мяркуюць, што шматлікія часткі маглі ўдзельнічаць у Маркаманскіх войнах, а пазней, у III ст. н. э., у марскіх і сухапутных паходах у Рымскую імперыю. Да III – IV стст. н. э. тэрыторыя рассялення славян значна павялічылася. Акрамя басейна Віслы славяне займаюць таксама Верхняе Паднястроўе, Днестра-Дняпроўскае міжрэчча. Іх селішчы дасягаюць ніжняга цячэння Дуная. Верагодна, на гэтым жа этапе Перасялення ў выніку міграцый, якія суправаджаліся пастаянным дзяленнем і адначасова аб'яднаннем плямёнаў, некалі адзіная супольнасць венетаў падзялілася на дзве часткі – славян (склавенаў) і антаў. Паступова ішоў працэс фарміравання двух племянных саюзаў. У склад кожнага ўваходзілі розныя плямёны, якія склад далі, відаць, асобныя этнасацыяльныя супольнасці [5, с. 85].

Як ужо адзначалася, важныя для нас звесткі знаходзяцца ў знакамітай «Гетыке» Іардана (VI ст. н. э.). Калі ён даходзіць да Дакіі, «умацаванай накшталт вянка крутымі Альпамі», то адзначае наступнае: «У левага іх схілу, які спускаецца да поўначы, пачынаючы ад месца нараджэння ракі Вістулы, на бязмерных прасторах размясцілася шматлюднае племя венетаў. Хоць іх назвы зараз змяняюцца адпаведна розным родам і мясцовасцям, усё ж пераважна яны завуцца склавенамі і антамі» [3, с. 71–72]. Далей ён сцвярджаў, што венеты – паходзяць ад аднаго кораня і вядомыя пад трыма імёнамі: венетаў, антаў, склавенаў [3, с. 90]. Менавіта ка-

ментарый Іардана лёг у аснову шматвяковай традыцыі, якая лічыць венетаў продкамі славян [8, с. 11]. Вядомы крыніцы, у якіх апісваецца, як выкарыстаць перабежчыкаў-славян для разведкі і суправаджэння войскаў [9, с. 18].

Гісторык шостага стагоддзя Пракопій Кесарыйскі зацікавіўся славянамі толькі таму, што яны кантактавалі з Візантыяй. Па гэтай прычыне Пракопій апускае імя венетаў і гаворыць толькі аб склавенах і антах. Па сведчанні аўтара, склавены і анты першапачаткова насілі агульнае імя – «споры» (грэч. – рассеяныя), якія жылі, па меркаванні Пракопія, «рассеяна», асобнымі пасёлкамі [10, с. 297–298]. Першы ўспамін аб спорах мы знаходзім у Іардана. Падчас Перасялення, якое апісвае гоцкі гісторык, готы ўступілі на тэрыторыю «Оюм» і адразу ж напалі на спалаў і разбілі іх [3, с. 70]. Назва «спалы» асабліва зблiжаецца з назвай «споры», упамянутай Пракопіем. Такім чынам, калі «спалы» Іардана і «споры» Пракопія супадаюць, то готы, якія рухаліся на поўдзень, перасеклі землі, населеныя продкамі славян [3, с. 196].

Як ужо адзначалася, склавены пражывалі паміж Карпатамі і Балтыйскім морам. У археалогіі тэрыторыя рассялення склавенаў суадносіцца з тэрыторыяй, занятай паўднёвым варыянтам пшэворскай культуры, якая сфарміравалася пры ўдзеле кельцкага субстрату, анты – у Падольска-Днястроўскім рэгіёне. Па сведчаннях археолагаў, з антамі суадносяцца носьбіты як падольска-дняпроўскага варыянта чарняхоўскай культуры [11, с. 594–605], так і кіеўскай культуры, якая часткова тэрытарыяльна перасякалася з чарняхоўскай, што толькі ўтваралася. Фарміраванне кіеўскай культуры, якая размяшчалася ў Сярэднім Падняпроўі, Падзясенні і на Дняпроўскім Левабярэжжы, праходзіла на базе рассеяных познезарубінецкіх груп помнікаў кіеўскага тыпу. Кіеўская культура, папярэдніца зарубінецкай без сумнення, славянская [12].

Мяркуюць, што антамі першапачаткова звалася славяна-скіфа-сармацкае насельніцтва міжрэчча Днястра і Дняпра, а пазней яго нашчадкі – славяне, якія сфармаваліся ва ўмовах славяна-іранскага сімбіёзу.

На першым этапе Вялікага перасялення народаў супрацьстаянне Рымскай імперыі было неістотным для славян. Аднак у канцы II ст. міграцыйныя хвалі готаў пракаціліся па землях венетаў. Пачалося актыўнае распаўсюджванне апошніх на суседнія землі ў заходнім і паўднёва-заходнім напрамках [5, с. 85].

Кароль готаў Эрманарых, кансалідаваўшы ўлады над усходнімі гоцкімі плямёнамі, пачаў падпарадкоўваць нягоцкія народы. У наш час у навукоўцаў існуюць пытанні, як Эрманарых змог аб'яднаць розныя этнічныя плямёны і ўтрымаць іх у дзяржаўным аб'яднанні. Мяркуецца, што меў месца добраахвотны саюз або плямёны аб'ядноўваліся насільна. З іншага боку, магчыма, аб'яднанне адбылося для абароны ад іншых германскіх плямёнаў, якія «гаспадарылі» ў Еўропе. Умацаваўшы сваю ўладу на паўднёвым усходзе, Эрманарых зрабіў паход на паўночны захад для заваёвы венетаў. Яны былі захоплены без асаблівых цяжкасцей: падпарадкаваліся ўладзе остгоцкага караля. Прызналі ўладу Эрманарыха і склавены [3, с. 90].

Венеты ў складзе насельніцтва вельбарскай культуры (І – V стст. н. э.) прасоўваюцца ў кірунку Паўночна-Заходняга Прычарнамор'я, дзе, верагодна, цераспалосна жылі з готамі і ўдзельнічалі ў вайсковых кааліцыях плямёнаў. Аповед Іардана аб вайне Эрманарыха з венетамі мэтазгодна супаставіць з масавым распаўсюджваннем у другой чвэрці IV ст. н. э. чарняхоўскіх помнікаў у лесастэпавай зоне Усходняй Украіны, якая ўваходзіла раней у арэал кіеўскай культуры [13, с. 322–330]. Археолагі лічаць, што носьбітамі кіеўскай археалагічнай культуры могуць з'яўляцца і венеты [14, с. 112–122].

Вядома, што прасоўваючыся на паўднёвы ўсход, готы ўступілі ў «межы антаў» [5, с. 85]. Да прыходу гунаў вайсковыя канфлікты паміж гэтымі плямёнамі, мабыць, адсутнічалі. Анты таксама прызналі ўладу Эрманарыха [3, с. 90]. Не выключана, што готы кантралявалі асноўныя гандлёвыя магістралі, якімі анты былі звязаны з іншымі плямёнамі.

Працяглыя шматгадовыя пошукі археалагічнага эквіваленту антаў і спрэчкі аб этнічнай прыналежнасці насельніцтва чарняхоўскай культуры далі нечаканыя вынікі. Археалагічныя культуры, якія не паддаюцца этнічнай інтэрпрэтацыі, ускосна адлюстроўваюць пераходны, мірны характар адносін паміж плямёнамі, што знаходзіліся ў зоне гэтых культур.

На другім этапе Вялікага перасялення народаў, калі гунам падпарадкоўваўся ўвесь варварскі свет, а мабільныя да гэтага часу германцы ўвайшлі ў межы імперыі, не схільныя да пастаянных пераездаў славянскія плямёны былі падхоплены хвалямі перасяленняў. У сувязі са з'яўленнем гунаў у Паўночным Прычарнамор'і паміж готамі і антамі адбыўся канфлікт. Паводле гістарычнага падання, яму папярэднічала ўварванне гунаў у межы «дзяржавы Эрманарыха», распад гэтай групоўкі і гібель конунга остготаў. Верагодна, сярод готаў Эрманарыха не было дастатковага адзінства, як яго не было і сярод нашчадкаў конунга. Адны з іх адвялі частку готаў да Днястра, размясціліся непадалёку ад го-

таў Атанарыха і не жадалі зліваццa з апошнімі. Некаторая частка готаў апынулася пад уладай гунаў [15, с. 134]. Стэпавая зона Паўночнага Прычарнамор'я да канца IV ст. н. э. ператварылася ў канфліктагенны рэгіён. Першапачаткова анты адбілі нападзенне готаў, але ў наступным конунг готаў Вінітарый распяў правадыра антаў Божа, у тым ліку семдзесят старэйшын. Нашэсце гунаў прымусіла частку славянскага насельніцтва пакінуць свае землі, шукаць выратавання на новых месцах і паклала пачатак тым пераходам славян, якія з асаблівай сілай разгарнуліся ў V ст. н. э. і прывялі да супрацьстаяння з Візантыйскай імперыяй, асваенню Балканскага паўвострава ў VI – VII стст. н. э. [5, с. 86].

Гістарычныя працэсы, якія адбываліся ў гэты час, спрыялі славянам і стэпавым качэўнікам, пераважна цюркам, быць суседзямі і ўзаемадзейнічаць. Агульным для іх увасабленнем сусветнай цывілізацыі і аб'ектам жадання была Рымская імперыя і Візантыя.

Складальнікі «Збору найстаражытных пісьмовых звестак аб славянах» адзначаюць, што ў Пракопія Кесарыйскага ўпамінанне «гунаў, склавінаў і антаў», якія знаходзіліся на Істры – Дунаі, уяўляе сабой «стэрэатыпную формулу»: пад гунамі ў Пракопія разумеюцца розныя народы, якія ўтварыліся ў выніку распаду гунскага племяннога саюза; склавіны і анты – дзве групоўкі праславян VI – пачатку VII стст. н. э. Гістарыяграфічная і гістарычная ўстойлівасць гэтага аб'яднання засведчана невізантыйскай (франкскай) крыніцай VII ст. н. э.: у «Франкскай касмаграфіі» гаворыцца аб склавах, хунах і вінідах (венетах, венедах), якія засяляюць Дунай [16, с. 235]. Варта адзначыць, што этнікон гуны (хуны) у франкскай крыніцы VII ст. н. э. адносіўся ўжо, магчыма, да авараў, але, мабыць, адлюстроўваў і раннюю, дааварскую гістарычную сітуацыю. Такім чынам, грэчаскія і лацінскія крыніцы апісваюць сітуацыю «звонку», і «адзінства» славян і «гунаў» можа быць звязана з агульнымі адносінамі да варвараў як да адзінай масы народаў, якія знаходзіліся на мяжы імперыі. Складаныя і супярэчлівыя адносіны з Візантыяй, якая выкарыстоўвала саюз з адным і варварамі супраць іншых, заключала з імі дагаворы і выплачвала даніну, «дазваляла» сяліцца ў былых рымскіх правінцыях, дапамагалі складанню першых «варварскіх» дзяржаў, завяршальнай стадыі цюркскага і славянскага этнагенезу. У храналагічных (VI – X стст. н. э.) і тэрытарыяльных (Цэнтральная Еўропа – Сярэдняе Падняпроўе) межах археалогія дае шматлікія прыклады этнакультурнага сінтэзу славянскіх і качэўніцкіх традыцый [16, с. 239–240].

Узаемадзеянне этнасаў, якія сфарміраваліся ў сярэдневяковую эпоху, не зводзілася да аднанакіраваных працэсаў панавання і падначалення, канфлікту і асіміляцыі: яго спектр быў шырэйшы, а найбольш каштоўным гістарычным урокам можна лічыць узаемаабмен дасягненнямі розных культур.

### Літаратура і крыніцы


1. *Леманс Ферлаг, Ю.Ф.* Нордическая идея [Электронный ресурс] / Ю.Ф. Леманс Ферлаг. – Мюнхен–Берлин, 1927. – Режим доступа: http://www.velesova-sloboda.org/antrop/hans-guenther-01.html. – Дата доступа: 2.10.2007.
2. *Кандыба, В., Золин, П.* История и идеология русского народа. В 2 т. / В. Кандыба, П. Золин. – СПб.: Лань, 1997. – Т. 1. – 512 с.
3. *Иордан.* О происхождении и деяниях гетов («Getica») / Иордан; вступ. ст., пер., коммент. Е.Ч. Скржинской. – М.: Издательство восточной литературы, 1960. – 436 с.
4. *Тацит Публий Корнелий.* Анналы. Малые произведения. История: пер. с лат. / Тацит Публий Корнелий. – М.: АСТ Ладомир, 2003. – 984 с.
5. *Буданова, В.П.* Великое переселение народов. Спецкурс / В.П. Буданова. – М.: Ин-т всеобщ. ист. Российской акад. наук, 2000. – 92 с.
6. *Мартынов, А.И.* Археология / А.И. Мартынов. – Москва: Высш. шк., 2005. – 447 с.
7. *Бор, М., Шавли, Й., Томажич, И.* Венеты: Наши давние предки [Электронный ресурс] / М. Бор, Й. Шавли, И. Томажич. – Москва, 2003. – Режим доступа: http://sventovid.narod.ru/TXT3H/venety1/h01.htm.– Дата доступа: 10.09.2007.
8. *Тулаев, П.В.* Венеты: предки славян / П.В. Тулаев. – М.: Белые альвы, 2000. – 192 с.
9. Хрестоматия по истории южных и западных славян. В 3 т. / редкол.: М.М. Фрейденберг (гл. ред.) [и др.]. – Минск: Изд-во «Университетское», 1987–1991. – Т. 1. Эпоха феодализма / М.М. Фрейденберг [и др.]. – 1987. – 272 с.
10. *Прокопий из Кесарии.* Война с готами / Прокопий из Кесарии; пер. с греч. С.П. Кондратьева, вступ. ст. З.В. Удальцовой. – М.: Издательство Академии наук СССР, 1950. – 515 с.
11. *Седов, В.В.* Этногенез ранних славян / В.В. Седов // Вестник Российской Академии Наук. – 2003. – № 7. – С. 594–605.
12. *Рыбаков, Б.А.* Язычество древней Руси [Электронный ресурс] / Б.А. Рыбаков. – Москва, 1987. – Режим доступа: http://www.w3.org/TR/REC-html40. – Дата доступа: 29.09.2006.
13. *Магомедов, Б.В.* Этнические компоненты черняховской культуры / Б.В. Магомедов // Stratum plus. – 2000. – № 4. – С. 322–330.
14. *Рассадин, С.Е.* Между Альпами и Океаном: венеты – «другие германцы»? / С.Е. Рассадин // Гісторыка-археалагічны зборнік. – 2002. – № 17. – С. 112–122.
15. *Вольфрам, Х.* Готы. От истоков до середины VI века / Х. Вольфрам. – СПб.: Ювента, 2003. – 656 с.
16. *Петрухин, В.Я., Раевский, Д.С.* Очерки истории народов России в древности и раннем средневековье / В.Я. Петрухин, Д.С. Раевский. – М.: Знак, 2004. – 416 с.


### Summary


*The article is devoted to the problems of origin of the Slavs' ancestors on the basis of written sources of IV – VII<sup>th</sup> centuries A.D. The article touches upon the role of the Veneti in the Slavs' ethnogeny. The actuality of the theme is caused by the reason that the political and ethnic map of Europe which have been developed after Great Resettlement of people, basically continues to exist up to now.*